Принципы, характеризующие процесс альтернативного разрешения споров (медиации): добровольность, конфиденциальность, равенство и сотрудничество, должны быть присущи посреднику в трудовых спорах, в связи с чем закрепление таковых на законодательном уровне выглядит весьма обоснованным.

Проведя сравнительный анализ посредничества и медиации в трудовых отношениях, необходимо выделить следующие различия данных процедур.

Во-первых, в качестве посредника вправе выступать любой независимый специалист, к которому законодательством не предъявляются особые требования. К медиатору в соответствии со статьей 4 Закона Республики Беларусь «О медиации» предъявлены достаточно строгие требования: наличие высшего юридического или иного образования, прохождение специальной подготовки, получение свидетельства, отсутствие судимости, полностью дееспособное и иные. В таком случае вполне обоснованно отдавать предпочтение квалифицированному обученному специалисту, особенно учитывая тот факт, что в коллективных трудовых спорах речь идет о правах и законных интересах трудовых коллективов.

Во-вторых, сроки применения указанных процедур существенно различаются. Для проведения медиации законодательством установлен шестимесячный срок, который исчисляется со дня заключения соглашения о медиации. В свою очередь, посредник после проведения консультаций с участниками спора обязан предоставить предложения о возможных вариантах разрешения спора не позднее 5 дней. В таком случае сроки применения обеих процедур должны быть унифицированы.

Исходя из проведенного анализа, следует отметить, что различия между медиацией и посредничеством весьма незначительны. Однако преимущества обращения к медиатору за разрешением спора очевидны: это обученный, специально подготовленный независимый специалист; законодательством Республики Беларусь в большей степени урегулированы основы осуществления данной процедуры.

Таким образом, медиация как несудебная форма защиты прав человека призвана гарантировать восстановление нарушенных прав, свобод и законных интересов человека и гражданина в ситуациях, когда судебная форма не подходит или менее эффективна. Но даже эта форма все еще имеет недостатки в регулировании. Однако развитие этого института способствует прогрессу верховенства закона в Республике Беларусь и реализации принципа гарантированности прав и свобод человека и гражданина в современную эпоху.

**Литература**

1 Трудовой кодекс Республики Беларусь [Электронный ресурс]: принят Палатой представителей 8 июня 1999 г.: одобр. Советом Республики 30 июня 1999 г. // КонсультантПлюс: Беларусь. Технология Проф. / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2019.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**УДК 342.81(476):342.81(4/5СНД)**

***А. А. Кудранок***

## РЭАЛІЗАЦЫЯ ПРАВА ВЫБІРАЦЬ І БЫЦЬ ВЫБРАНЫМ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ І АСОБНЫХ КРАІНАХ СНД

*У дадзеным артыкуле разгледжана адно з палітычных правоў грамадзян – права выбіраць і быць выбраным. Асаблівая ўвага нададзена прынцыпу ўсеагульнасці*

*актыўнага і пасіўнага выбарчага права. Праведзены параўнальны аналіз замацавання ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь і некаторых іншых краін СНД выбарчага права асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай.*

Узнікшы ў глыбокай старажытнасці, правы чалавека набываюць універсальнае значэнне толькі ў буржуазную эпоху, са сцвярджэннем у грамадстве прынцыпаў свабоды і юрыдычнай роўнасці. Так, правы чалавека першага пакалення фарміруюцца з перамогай буржуазных рэвалюцый у Еўропе. Першае пакаленне правоў чалавека – неадчужальныя асабістыя (грамадзянскія) і палітычныя правы. Пасля Другой сусветнай вайны, якая суправаджалася грубымі масавымі парушэннямі правоў чалавека, яны выйшлі за межы ўнутрыдзяржаўнай праблемы і сталі прадметам пастаяннай увагі міжнароднай супольнасці: прызнанне Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод, Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах і шэрагу іншых найважнейшых міжнародна-прававых актаў з'явілася неацэнным укладам у развіццё цывілізацыі і культуры XX ст.

Права грамадзян выбіраць і быць выбраным – адно з асноўных палітычных правоў грамадзян, якое стаіць у цэнтры ўсіх працэсаў фарміравання органаў дзяржавы. Так, у адпаведнасці з артыкулам 25 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах «кожны грамадзянін павінен мець без якой бы там ні было дыскрымінацыі, згаданай у артыкуле 2, і без неабгрунтаваных абмежаванняў права і магчымасць: галасаваць і быць выбраным на сапраўдных перыядычных выбарах, якія праводзяцца на аснове ўсеагульнага роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні і забяспечваюць свабоднае волевыяўленне выбаршчыкаў». Сваё замацаванне дадзенае палітычнае права атрымала ў заканадаўстве розных дзяржаў, у першую чаргу, на канстытуцыйным узроўні.

Так, у артыкуле 38 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацавана права грамадзян Рэспублікі Беларусь свабодна выбіраць і быць выбранымі ў дзяржаўныя органы на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага, прамога або ўскоснага выбарчага права пры тайным галасаванні [1].

Як бачым, у дадзеным артыкуле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацаваны асноўныя прынцыпы выбарчага права. Яны атрымалі сваё развіццё і ў Выбарчым кодэксе Рэспублікі Беларусь.

Асаблівай увагі заслугоўвае прынцып усеагульнасці як актыўнага, так і пасіўнага выбарчага права грамадзян, які мае пэўныя абмежаванні пры рэалізацыі названага права. Артыкул 64 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь устанаўлівае: «У выбарах не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, асобы, якія ўтрымліваюцца па прыгавору суда ў месцах пазбаўлення волі. У галасаванні не прымаюць удзелу асобы, у адносінах да якіх у парадку, устаноўленым крымінальна-працэсуальным заканадаўствам, выбрана мера стрымання – утрыманне пад вартай». Аднак пакуль асоба ўтрымліваецца пад вартай і ей не вынесены абвінаваўчы прысуд, які ўступіў у законную сілу, прававы статус грамадзяніна захоўваецца. Па сутнасці, асобы, якія ўтрымліваюцца пад вартай у чаканні прысуду, з'яўляюцца паўнапраўнымі грамадзянамі, абмежаванымі толькі ў асабістай свабодзе. Такім чынам, можна зрабіць выснову аб некаторай неадпаведнасці палажэнняў артыкула 64 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прынцыпу прэзумпцыі невінаватасці, замацаванаму ў артыкуле 26 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Для параўнання, артыкул 32 Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі абвяшчае: «Не маюць права выбіраць і быць выбранымі грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, а таксама якія змяшчаюцца ў месцах пазбаўлення волі па прысуду суда» [2]. Як бачым, абмежаванне актыўнага права асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

не замацавана на канстытуцыйным узроўні ў Расіі. Прадастаўленне асобам, заключаным пад варту, магчымасці рэалізаваць свае выбарчыя правы азначае, што дзяржава не пазбаўляе іх палітыка-прававой праваздольнасці. Пры гэтым трэба падкрэсліць, што гэтыя асобы маюць права не толькі выбіраць, але і быць выбранымі.

Аналагічнае палажэнне змяшчаецца таксама і ў артыкуле 33 Канстытуцыі Рэспублікі Казахстан. Акрамя гэтага, аб наяўнасці выбарчага права ў асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, указвае артыкул 23 Канстытуцыйнага закона Рэспублікі Казахстан ад 28 верасня 1995 г. № 2464 «Аб выбарах у Рэспубліцы Казахстан», які рэгламентуе пытанні ўтварэння выбарчых участкаў у следчых ізалятарах, парадак складання спісаў выбаршчыкаў па выбарчых участках, утвораных у следчых ізалятарах і ізалятарах часовага ўтрымання [3].

Што тычыцца выбарчага права грамадзян Рэспублікі Узбекістан, то варта заўважыць, што частка 4 артыкула 117 Канстытуцыі Рэспублікі Узбекістан аналагічна з разгледжанымі вышэй дзяржавамі замацоўвае, што не могуць быць выбранымі і не ўдзельнічаюць у выбарах грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, а таксама асобы, якія змяшчаюцца ў месцах пазбаўлення волі па прысудзе суда. У любых іншых выпадках прамое або ўскоснае абмежаванне выбарчых правоў грамадзян не дапускаецца. Больш таго, артыкул 34 Канстытуцыі Літоўскай Рэспублікі устанаўлівае: «У выбарах не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі» [4]. Гэта палажэнне азначае таксама і адсутнасць абмежавання права голасу ў асоб, якія ўтрымліваюцца ў месцах пазбаўлення волі па прыгавору суда, а не толькі асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай.

Такім чынам, з праведзенага аналізу заканадаўства асобных краін СНД і палажэнняў міжнародных актаў мы бачым, што абмежаванне актыўнага выбарчага права асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, не замацавана на канстытуцыйным узроўні разгледжаных дзяржаў.

Адносна пытання аб абмежаванні пасіўнага выбарчага права дадзенай катэгорыі асоб варта адзначыць, што прававой рэгламентацыі ў канстытуцыях вышэй згаданых дзяржаў дадзенае абмежаванне не атрымала, таксама як і ў Рэспубліцы Беларусь. Заканадавец зыходзіць з таго, што калі не абмяжоўваецца актыўнае выбарчае права, такім чынам, пасіўнае выбарчае права асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, таксама не можа быць абмежавана. У Рэспубліцы Беларусь хоць і ёсць палажэнне аб абмежаванні актыўнага выбарчага права названай катэгорыі грамадзян, але не рэгламентавана забарона асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, быць выбранымі.

Варта заўважыць, што рэалізацыя пасіўнага выбарчага права асобамі, якія ўтрымліваюцца пад вартай, ва ўмовах ізаляцыі відазмяняецца. Так, утрыманне пад вартай не дае магчымасці кандыдатам асабіста рэалізаваць свае правы кандыдата пры правядзенні передвыбарнай агітацыі, праводзіць сустрэчы з выбаршчыкамі, свабодна і ўсебакова абмяркоўваць свае перадвыбарчыя праграмы на сходах, мітынгах і праз сродкі масавай інфармацыі, а таксама выступаць у тэледэбатах. Аднак з праведзенага аналізу заканадаўства названых вышэй краін мы высветлілі той факт, што ў выбарчай кампаніі разам з кандыдатамі актыўна ўдзельнічаюць і іх даверaныя асобы. Яны дапамагаюць кандыдату ў правядзенні выбарчай кампаніі, вядуць агітацыю за яго абранне, прадстаўляюць інтарэсы кандыдата ва ўзаемаадносінах з дзяржаўнымі органамі, грамадскімі аб'яднаннямі, выбаршчыкамі, а таксама ў камісіях. Іх паўнамоцтвы ўзнікаюць разам з рэгістрацыяй кандыдата і спыняюцца са сканчэннем выбарчай кампаніі.

Такім чынам, разгледжаны прынцып усеагульнага выбарчага права дазваляе нам зрабіць выснову аб тым, што ёсць пэўныя абмежаванні пры рэалізацыі права выбіраць і быць выбраным. У прыватнасці, прааналізаваўшы становішча асоб, якія ўтрымліваюцца пад



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вартай, высветлілі, што ў Рэспубліцы Беларусь, у адрозненне ад заканадаўства разгледжаных дзяржаў, дадзеная катэгорыя асоб адносіцца да суб'ектаў, актыўнае выбарчае права якіх абмежавана. Аднак адносна права быць выбраным устанавілі, што асобы, якія змяшчаюцца пад вартай, валодаюць магчымасцю рэалізаваць пасіўнае выбарчае права.

З улікам вышэй пададзенага лічым неабходным з артыкула 64 Канстытуцыі, а таксама з артыкула 4 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь выключыць наступнае палажэнне: «У галасаванні не прымаюць удзелу асобы, у адносінах да якіх у парадку, устаноўленым крымінальна-працэсуальным заканадаўствам, выбрана мера стрымання – утрыманне пад вартай». Зыходзячы з гэтага прапануем частку 2 артыкула 64 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь выкласці ў наступнай рэдакцыі: «У выбарах не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, асобы, якія ўтрымліваюцца па прыгавору суда ў месцах пазбаўлення волі. Любое прамое або ўскоснае абмежаванне выбарчых правоў грамадзян у іншых выпадках з'яўляецца недапушчальным і караецца згодна з законам». Таксама прапануем частку 2 артыкула 4 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь выкласці ў наступнай рэдакцыі: «У выбарах не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, асобы, якія ўтрымліваюцца па прыгавору суда ў месцах пазбаўлення волі».

**Літаратура**

1 Конституция Республики Беларусь: с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г. – Минск: Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2016. – 64 с.

2 Конституция Российской Федерации (принята всенародным голосованием 12.12.1993) (с учетом поправок, внесенных Законами РФ о поправках к Конституции РФ от 30.12.2008 N 6-ФКЗ, от 30.12.2008 N 7-ФКЗ, от 05.02.2014 N 2-ФКЗ, от 21.07.2014 N 11-ФКЗ) // Собрание законодательства РФ. – 2014. – N 31. – 4398 с.

3 О выборах в Республике Казахстан [Электронный ресурс]: Конситуционный закон Республики Казахстан от 28 сентября 1995 года № 2464. – Режим доступа: //online.zakon.kz/. – Дата доступа: 08.04.2019.

4 Конституция Литовской Республики: принята гражданами Литовской Республики путем референдума 25 октября 1992 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://worldconstitutions.ru/?p=115. – Дата доступа: 08.04.2019.

**УДК 346.93(476):346.93(470):346.93(477)**

***А. А. Кушнярова***

# АРБІТРАЖНЫ РАЗБОР У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ, РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ І УКРАІНЕ: ПАРАЎНАЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

*Артыкул прысвечаны пытанню прымянення пры вырашэнні спрэчкі ў арбітражным судзе «права справядлівасці» (ex aequo et bono) або прыняцця арбітражнага рашэння ў парадку «сяброўскага пасярэдніка» (amiable compositeur). Разгледжана заканадаўства Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Беларусь і Украіны, а таксама міжнародныя дагаворы, такія як Еўрапейская канвенцыя аб знешнегандлёвым арбітражы, Тыпавы закон ЮНСІТРАЛ «Аб міжнародным гандлёвым арбітражы».*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ